# Генеалогія ў Беларусі на сучасным этапе



**Вадзім Урублеўскі,**
загадчык аддзелу даследавання рукапісаў Цэнтра даследаванняў старадрукаваных выданняў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі,
кандыдат гістарычных навук

Генеалагічны напрамак актуалізуецца ў навуковым дыскурсе па прычыне запатрабаванасці як у вырашэнні выключна гістарыяграфічных задач запаўнення факталагічных лакун, так і праз зацікаўленасць грамадства ў павышэнні колькасці і якасці даступнага матэрыялу. Апошні момант пераводзіць гэты напрамак таксама ў сферу грамадскага дыскурсу, робіць яго агульным для навукоўцаў і аматараў. Пры гэтым увага акцэнтуецца не толькі на фактарах сямейна-роднасных сувязяў, але і на кампанентах, што знаходзяцца ў сферы ўвагі іншых дысцыплінарных і міждысцыплінарных кірункаў. Так, прозвішчы і імёны з'яўляюцца прадметам даследавання антрапанімікі, гістарычны лакальны кантэкст – рэгіянальнай гісторыі і мікрагісторыі, сямейны архіў – архівазнаўства, вербальныя ўспаміны – вуснай гісторыі і г.д. Такім чынам генеалогія непарыўна звязваецца з лёсам канкрэтнай сям'і, застаючыся яе персаніфікуючай асновай.

У той час як большасць спецыяльных гістарычных дысцыплін развіваецца выключна намаганнямі навукоўцаў, генеалогія можа папаўняцца новымі ведамі з боку звычайных прадстаўнікоў грамадства, якія не маюць спецыяльнай адукацыі. Прычына палягае ў значнай наблізканасці тэмы да актуальных для сучаснага чалавека пытанняў паходжання і самаідэнтыфікацыі, а таксама ў сувязі з адсутнасцю такога прадукта навуковай дзейнасці, які б адпавядаў чаканням грамадства. Праявы навуковай і ненавуковай актыўнасці знаходзяць адбітак у дзьвюх сферах: кніжнай вытворчасці *(мал. 1)* і інтэрнэт-сетцы *(мал. 2)*.

Кніга як выбітная адзінка інфармавання і завершаны прадукт дзейнасці свайго стваральніка дамінавала ў грамадстве да з'яўлення Інтэрнэту, надыходу лічбавізацыі, стварэння нейрасетак. Тэхналагічны прарыў значна спрашчае пошук і аптымізуе аналітычную працу з вялікімі масівамі даступных даных. У перыяд, калі друкаваныя сродкі губляюць свой патэнцыял, робячыся выключна дарагой рэпрэзентацыяй асобы свайго стваральніка, інтэрнэт-рэсурсы, якія могуць накапляцца ананімна, стыхійна і бессістэмна, усё больш запаўняюць сабой інфармацыйную прастору па прычыне лепшай даступнасці ў параўнанні з прадметамі камплектавання архіўных стэлажоў, бібліятэчных і крамных паліц.



*Мал. 1.* Гербоўнік беларускай шляхты – самае працяглае беларускае серыйнае выданне, якое ажыццяўляецца ў сферы генеалогіі




*Мал. 2.* Архівы Беларусі – афіцыйны сайт беларускай архіўнай галіны

## Праблемы пошукавай дзейнасці

Асноўныя перашкоды ў генеалагічнай справе ў Беларусі звязаны са зваротам да архіўных крыніц і адсутнасцю спецыяльнай кваліфікацыі ў збіральніка і распаўсюджвальніка інфармацыі. Калі другі фактар характарызуе працэс масавага звароту да даных, то першы з'яўляецца аднолькавай праблемай як для навукоўцаў, так і для аматараў.

Цяжкасці з пошукам генеалагічных крыніц палягаюць у некалькіх вымярэннях, што выцякаюць адно з другога. Так, складанасці ў сувязі з геаграфічнай аддаленасцю ад месца захавання інфармацыі нараджаюць праблемы з дыстанцыйным доступам па прычыне адсутнасці навукова-даведачнага апарату або лічбавай копіі неабходнага дакумента ў вольнай прасторы, а таксама звестак пра месца захавання адзінкі ў канкрэтнай установе і аркушоў размяшчэння патрэбнага матэрыялу ў справе. У большасці чытальных залаў дзяржаўных архіваў на постсавецкай прасторы, у тым ліку ў Беларусі, забаронена самастойнае капіраванне на ўласную тэхніку. Часткова гэта кампенсуецца сусветна вядомым генеалагічным праектам «FamilySearch» (familysearch.org), які ажыццяўляе бясплатны доступ да значнай колькасці генеалагічных збораў, у тым ліку да некаторых фондаў абодвух Нацыянальных гістарычных архіваў Беларусі (НГАБ) у Мінску і Гродна. Аднак адзначым, што вопісы фондаў ключавых рэспубліканскіх і некаторых абласных архіваў ужо выкладзены ў агульны доступ на іх сайтах.

Не апошняе месца займаюць пытанні стану камерцыйнай генеалогіі, кошту выкананых паслуг з боку архіўных устаноў, стаўленне іх супрацоўнікаў – прафесійных архівістаў – да грамадзян-карыстальнікаў, што шукаюць цікавыя для іх звесткі. Апошні момант звязаны са старэйшым пакаленнем архівістаў, якія сутыкнуліся з лавінамі «радаводнікаў» толькі ў апошнія дзесяцігоддзі. Падазронасць тлумачыцца непрыняццем камерцыялізацыі генеалагічнай сферы і ў цэлым бізнэсу, звязанага з пошукам і стварэннем прадукта на замову. Нярэдка ахвярамі нарматыўна неабгрунтаваных адмоў у доступе да інфармацыі становяцца прафесійныя навукоўцы, якім не выдаюць генеалагічныя крыніцы на падставах быццам бы нелегальнай камерцыйнай дзейнасці.

Адсутнасць спецыяльнай гістарычнай кваліфікацыі, паглыбленасці ў тэму ці абазнанасці ў пытаннях архіўнага захавання нярэдка прыводзіць да сур'ёзных факталагічных памылак. Выйсце з пошукавых праблем кожны навуковец і аматар шукаюць самастойна. На сённяшні дзень у краіне так і не з'явілася рэспубліканскага ўсеагульнага генеалагічнага аб'яднання, якое б сачыла за кваліфікацыяй генеалогаў-аматараў, якасцю індывідуальнай працы на замову і курыравала б пытанне супрацоўніцтва грамадскага сектару з дзяржаўнымі архівамі, падпарадкаванымі праз Дэпартамент па архівах і справаводству непасрэдна Міністэрству юстыцыі Рэспублікі Беларусь.




*Мал. 3.* Лекцыю «Сфера генеалогії: асаблівасці генеалагічных даследаванняў» у межах праекта Акадэмія маладых генеалогаў пры Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі праводзіць В. Урублеўскі

Аднак ствараюцца асобныя згуртаванні ў папулярных сацыяльных сетках, аб'яднаныя пошукавым інтарэсам да пэўных храналагічна-тэрытарыяльных адзінак. Іх члены ўдасканальваюць свае навыкі па методыцы і прачытанню дакументаў, супольна аплачваюць адлічбоўку спраў генеалагічнага характару па патрэбных ім гістарычных адміністрацыйных рэгіёнах (паветах або валасцях). Праца па стварэнні лічбавых копій вядзецца рэспубліканскімі архівамі, з якіх асабліва неабходна адзначыць Нацыянальныя гістарычныя архівы Беларусі ў Мінску і Гродна і Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Імі, а таксама іх структурнымі падраздзяленнямі распачынаюцца адукацыйныя афлайн- і анлайн-праекты ў сферы генеалогіі *(мал. 3)*. Асабліва на гэтай ніве неабходна адзначыць YouTube-каналы Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі і не раз згаданага НГАБ.

## Асноўныя і альтэрнатыўныя генеалагічныя крыніцы і праца з імі

Генеалагічны пошук з'яўляецца фундаментальнай часткай даследавання і мае сваю сістэму апрацоўкі актуальнага матэрыялу, што



*Мал. 4.* Выгляд стандартнага развароту метрычнай кнігі праваслаўнай канфесіі аб народжаных і хрышчаных у Мінскай епархіі за 1855 г.

залежыць ад захаванасці і спецыфікі адпаведных крыніц, а таксама ад сукупнасці верыфікаваных і неверыфікаваных пачатковых звестак.

Першасным блокам генеалагічных крыніц XVIII – пачатку XX ст. у дачыненні да Беларусі выступаюць метрычныя кнігі канфесійных устаноў і перапісы (у тым ліку рэвізскія сказкі), якія праводзіліся дзяржаўнымі органамі ўліку насельніцтва і паліцэйскага нагляду за ім. У дачыненні да тэрыторый, па якіх зберагласе падборка асноўных звестак – метрычных кніг і перапісаў, радавод складаецца з большым поспехам, чым у адносінах да рэгіёнаў, дзе захаванасць адпаведных матэрыялаў горшая ці аднабаковая.

Па гэтай прычыне актуальным бачыцца выкарыстанне альтэрнатыўных крыніц інфармацыі, якія на дадзены час схаваныя ад вока як аматараў генеалогіі, так і навукоўцаў. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі такімі з’яўляюцца: экстракты (выпіскі) з незахаваных метрычных кніг канфесійных устаноў пачатку XX ст.; дадатковыя рэвізскія сказкі, якія складаліся пасля апошняй асноўнай рэвізіі 1858 г.; журналы і пастановы губернскіх прысутнасцяў, аб’яднаных палат, акруговых судоў за другую палову XIX – пачатак XX ст.; матэрыялы землеўладкавальных камісій і палюбоўных судоў пачатку XX ст.; кнігі паявтовых ашчадных кас канца XIX – пачатку XX ст.; дакументы з фондаў навучальных устаноў XIX – пачатку XX ст.; дакументы перасяленчага характару канца XIX – пачатку XX ст. (знешняя міграцыя і ўнутраная каланізацыя зямель праз куплю-продаж); інвентары памешчыцкіх і казённых уладанняў XVII ст.– 1840-х гг. Гэта толькі няпоўны пералік таго, што можа быць карысна даследчыку ў яго канкрэтным выпадку, вынікаючы з такіх крытэрыяў, як саслоўная прыналежнасць, геаграфічная і храналагічная прывязка.

Самым складаным і масіўным комплексам з’яўляюцца менавіта метрычныя кнігі, якія ў выпадку цэласнай захаванасці вымагаюць ад даследчыка першаснага і другаснага прагляду *(мал. 4)*. Першы праводзіцца з мэтай устанаўлення прамой лініі патрэбнай асобы і вядзецца ўглыб, другі закліканы вывучаць іншыя бакавыя лініі роду, што адыходзяць ад устаноўленага родапачынальніка, і праводзіцца ад яго да нашчадкаў.

Кожная генеалагічная крыніца патрабуе ўважлівага прачытання і інтэграцыі ў кантэкст свайго стварэння. Звесткі з яе верыфікуюцца на падставе іншых дакументаў афіцыйнага (дзяржаўнага) і неафіцыйнага (прыватнага) паходжання. Важнай кропкай з’яўляецца сістэматызацыя матэрыялу ў дачыненні да канкрэтнай пошукавай сітуацыі, калі патрабуецца дасціпная прапрацоўка ўсёй магчымай крыніцавай базы. Неабходнасць прымянення метадаў палеаграфіі, філалогіі, гістарычнай геаграфіі, рэгіянальнай гісторыі, біяграфістыкі робіць генеалагічнае даследаванне сур’ёзнай працай. Па гэтай прычыне дылетантызм у дзейнасці генеалога падрывае давер як да крыніцы, так і да самой ідэі аб’ектыўнасці гэтай справы.

## Перспектывы навуковай генеалогіі

Аб’екты даследавання, якімі з’яўляюцца апублікаваныя і неапублікаваныя звесткі, уплываюць на фарміраванне прадмету пошуку. На нашу думку, перспектыўнымі тэмамі навуковай аналітыкі ў сферы генеалогіі могуць лічыцца радаводы знакамітых беларусаў; гісторыя вёскі, маёнтка, горада, парафіі, прыходу ў святле генеалагічных крыніц; аналітыка іх захаванасці па рэгіёне і ацэнка ступені ўнікальнасці.

У якасці падсумавання адзначым, што шляхамі далейшай працы бачацца наступныя напрамкі: функцыянаванне ў анлайн- і афлайн-фарматах адукацыйных праектаў у сферы беларускай генеалогіі; аб’яднанне высілкаў дзяржавы і грамадства ў пытаннях апублічвання і выкарыстання інфармацыі; стварэнне анлайн-праектаў, якія б выступалі даведнікамі па ўжо апублікаваных раней крыніцах.